**Мятліцкая Г.М. (Мінск)**

## Аўтабіяграфізм у зборніку Максіма Танка “Мой каўчэг”

Паэтычны зборнік М. Танка “Мой каўчэг” (1994), як вядома, апошні прыжыццёвы зборнік паэта, дзе змешчаны творы, напісаныя ў перыяд з 7 лютага 1989 года да 15 снежня 1992 года. Аўтар размясціў вершы паводле храналагічнага прынцыпу, гэтаксама як і ў зборніку “Errata” (1996). Таму зборнік “Мой каўчэг” – своеасаблівы дзённік, у якім адлюстраваны думкі паэта на працягу амаль трох гадоў, мастацкая біяграфія паэтавай душы. Храналагічнае размяшчэнне твораў у зборніку ўжо само па сабе з’яўляецца сведчаннем яго аўтабіяграфізму. Можна прасачыць, у якія дні аўтар напісаў некалькі вершаў, а калі не пісаў наогул або пісаў, але не палічыў патрэбным уключыць іх у зборнік. М. Танк заўсёды ставіў дату пад сваімі творамі. Па гэтых датах, перагортваючы кнігу, можна паназіраць за тым, што хвалявала паэта, уявіць яго творчае жыццё. У асноўным ён пісаў па адным або па два вершы ў дзень, але ёсць і чатыры вершы (7 мая 1990 года). А, да прыкладу, верш “Шчаслівыя часы”, напісаны 9 ліпеня 1989 года, застаўся не ўключаным у гэты зборнік [1, с. 572]. М. Танк праўдзівы і дакладны ў фактуры вершаў, шчыры ў размове са сваім чытачом.

Адной з цэнтральных тэм у зборніку “Мой каўчэг” з’яўляецца тэма чалавечага лёсу, якая раскрываецца праз асэнсаванне паэтам свайго жыццёвага шляху. У многіх вершах знаходзім роздум творцы пра асабістае. Так, у вершы “З пачуццём нейкага суму…” паэт параўноўвае сваё жыццё са шляхам у пустыні, адзначае, што да захаду сонца ўжо можна дастаць рукой. Падобны і змест верша “Засталіся даўно”, у якім М. Танк разглядае дасягненне рознага ўзросту чалавекам як пераадоленне пэўных вышынь, заўважае, што старасць – самая “неабсяжная і найцяжэйшая / З прыжыццёвых вяршынь” [2, с. 104].

У кнізе яскрава выяўлены гістарызм мыслення паэта: у многіх творах па-майстэрску перададзены рэаліі тагачаснага жыцця (1989–1992), роздумна асэнсоўваецца пражытае і перажытае, творца звяртаецца да падзей і постацей даўніны. Асобныя творы нагадваюць дзённікавыя запісы – яны маглі быць напісаны пад уражаннем канкрэтнай сустрэчы або гутаркі з пэўным чалавекам (напрыклад, вершы “Гутарка з Т. Бароўскім”, “Гутарка з унучкай”), з’яўляюцца мастацкім водгукам на паездку за мяжу або адлюстроўваюць гісторыка-культурныя адметнасці якой-небудзь замежнай краіны (напрыклад, вершы “Перад развітаннем” – пра Фларэнцыю, “Затое” – пра Татры). У зборніку прасочваюцца асаблівыя адносіны паэта да польскай культуры і літаратуры, добрае іх веданне (у некаторых вершах сустракаем

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вобразы польскіх дзеячаў, напрыклад: "«Атамная зіма» Б.В. Лінке", "Хто табе, дружа Слабоднік, сказаў…", "Мемарыяда").

Максім Танк асэнсоўвае вехі свайго жыцця і вехі XX стагоддзя. У вершы "Тады… тады…" паэт расказвае пра сваю маці Домну Іванаўну, якая, калі ўспамінала якісьці выпадак, па-свойму ўдакладняла час, называючы тыя моманты, якія ёй найбольш запомніліся. Праз гэтыя штрыхі-ўспаміны не толькі паказваюцца падзеі з жыцця іх сям'і, у асноўным трагічныя моманты, што запомніліся будучаму творцу з аповедаў маці, але яны і ўскосна сведчаць, якой была маці паэта. У гэтым вершы адлюстраваліся наступныя біяграфічныя рэаліі: калі маці дзевавала, у Крывічах пракладвалі чыгунку; з бежанства яны вярнуліся на свой апусцелы надзел; калі паліцыя забірала сына (М. Танка), маці, праводзячы, прасіла, каб яго не білі; прыйшлі Саветы, і саслалі ў Сібір цётак Соню і Полю з малымі, свата Анупрэя, Ганулю-павітуху, якая бабіла малога Яўгена Скурко (прымала яго ў час родаў); немцы спалілі Слабаду з людзьмі, дачушку Верачку (сястру паэта) забілі з малым; партызаны прынеслі вестку, што паэт жывы і ўзнагароджаны, а маці, даведаўшыся пра гэта, усю ноч праплакала і цалавала ліст газеты; упаўнаважаны хацеў застрэліць як кулака бацьку паэта за лішнія калоды пчол і яблыні, пасля гэтага маці скруціла немач. Гэтыя рэаліі для М. Танка – "хлеб чорствы ўспамінаў": менавіта слухаючы матчыны аповеды-ўспаміны, ён спасцігаў цяжар чалавечага жыцця, не ўсё з якога можна перадаць словамі.

Вельмі часта паэт згадваў Вялікую Айчынную вайну. Пра гэты жахлівы час ён успамінае і ў вершы "Ноч вераб'іная", у якім спачатку апісваецца навальніца, а далей гаворыцца, што грымотная цемень паэту "прыгадала ноч другую: / Нямоўчнай кананады роў, / Дарогу ў пекла. Франтавую. / Сярод руін разбіўшы "додж", / Сяброў адсутнасць на праверцы…" [2, с. 80]. Такімі асацыяцыямі суправаджае паэта вайна. Верш заканчваецца радкамі: "Стаю на ганку. Можа, дождж / Крыху астудзіць боль у сэрцы" [2, с. 80]. (У М. Танка было хворае сэрца, у яго дзённіках часам гаворыцца пра лячэнне ў бальніцы). У фінале верша "Гутарка з унучкай" на пытанне ўнучкі, "А ад чаго пасівела / Твая галава?", паэт адказвае: "Знаць, ад папялішчаў / Ваенных, унучачка. / Ад папялішчаў" [2, с. 16].

Многія вершы ўтрымліваюць успаміны творцы пра яго маленства і юнацтва, праз якія таксама раскрываюцца асобныя эпізоды з яго жыцця. Так, у вершы "На гарышчы" паэт згадвае, якім "страшнаватым" яму, малому, здавалася гарышча дзедаўскай хаты; хлопчыку з багатай фантазіяй падавалася, што там у ламаччы жылі чэрці і здані і спраўлялі там "паўночныя гарцы". Верш – як бы замалёўка з дзяцінства паэта. Калі ён прыязджаў на

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

малую радзіму, на месцы дзедавай хаты “адзін толькі камень / Чарнее сярод папялішча” [2, с. 78], і паэт успамінае забытыя ўсімі прыгоды.

Магчыма, наяўнасць шматлікіх успамінаў пра ўбачанае і перажытае, пра сваё жыццё, выпадкі з яго, пра знаёмых людзей – гэта адна з прыкмет паэтавага ўзросту (падчас напісання зборніка “Мой каўчэг” класіку было каля 80 гадоў). Паэт часта згадвае “то наяве, то ў сне” сваё юнацтва і нават тагачасную прыроду: снег “ля пількаўскіх двароў”, кажа, што маладым чытачам гэта, магчыма, падасца смешным (верш “Я часта ўспамінаю…”); у яго маленстве салодкімі здаваліся ледзяшы (верш “Ледзяшы”).

Навучанне ў школе апісваецца ў вершах “Грыфельная дошка” і “Плюсквамперфектум”. Маленства паэта прыпала на час, калі было мала кніг і паперы. На грыфельнай дошцы ён атрымаў ад настаўніцы “двойку” за тое, што не змог рашыць задачу, – і след ад “двойкі” застаўся надоўга. У другім вершы расказваецца яшчэ адна гісторыя з яго жыцця: у школе ён не разумеў паняцця “плюсквамперфектум” – ‘даўномінулы час’. Паэт разважае, што, калі вывучалі гэту тэму, ён сапраўды не мог яе разумець, бо ў яго тады не было даўномінулага часу. У твор уключаны і такі ўспамін з яго школьных гадоў: “Я толькі пачаў пазнаваць / Белы свет, / Прыглядацца пільней / Да сяброўак па класу / І адной падарыў з іх / Свой першы санет, / За які мне вымову / Даў школьны савет” [2, с. 69].

У вершы “Буда” знаходзім апісанне фэсту ў Будзе. Паэт прыкмячае, што нехта ехаў туды да бернардзінцаў, а нехта – як і ён – паглядзець на “цуды”, як скача мядзведзь, навінаў паслухаць, прыгледзець дзяўчыну, “з людзьмі палюдзець” [2, с. 157], каб да наступнага фэсту ўспамінаць пра дзівы. У вершы “Сон былога калядоўшчыка” расказваецца пра калядаванне – лірычнаму герою яно прыснілася.

Аўтар згадвае ў вершы “Рэха”, як некалі хадзіў у лес па ягады, грыбы, арэхі – “і часам, заблудзіўшы / Ў лабірынце хвой, / Знаходзілі сябе / Па адгалосках рэха” [2, с. 28], а сёння яго там ніхто не кліча. Падобны да гэтага і верш “Сніў: старыя рамантую кары…”. Калісьці кары вазілі яго мары, “і скрыпелі, і спявалі гожа / Пад цяжарам сена, снапоў збожжа” [2, с. 199]. А цяпер няма куды ехаць, няма тых, хто яго чакае.

Матывам смутку па сябрах і родных прасякнуты верш “На вакзале”. Усё змяняецца ў жыцці, ужо многае засталося ў мінулым. У творы адухоўлены вобраз семафора, які “лыпае…/ Злосным / Чырвоным вокам / Цыклопа”, нібы хоча сказаць паэту: “І чаго ты прыходзіш / На вакзал? / Цягнікі з тваімі сябрамі, / Радасцямі, / Спадзяваннямі / Даўно адышлі / У мінулае. / А ты ўсё нечага чакаеш” [2, с. 75]. М. Танк перажыў сваю дачку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Верачку, яе памяці ён прысвяціў верш “Лягла на сэрца цемень ночы…”, які ўвайшоў у гэты зборнік.

Развыжанні пра тагачаснае жыццё знаходзім у вершы “Не знаю”. Метафарычнай мовай класік гаворыць пра бальніцу: “На каралеўскай, / Шпітальнай пасцелі, / І пад аховай анёлаў / У белых халатах” [2, с. 125], прыгадвае, што яму раней спалася і на мулкай лаве, і на зямлі, утрамбаванай снарадамі, і пад дажджом, і ў паходзе – у самых неспрыяльных умовах, а цяпер у бальніцы не спіцца.

Максім Танк вёў актыўную перапіску з роднымі, сябрамі і знаёмымі – гэта таксама адлюстравалася ў вершах. У сваім дзённіку паэт аднак прызнаваўся: “Не люблю гэты эпісталярны занятак і марнаванне на яго свайго часу” [1, с. 565]. Лірычны герой верша “Перапіска” гаворыць, што ён скарачае перапіску не таму, што ўжо цяжка ісці ветэрану да пошты, а таму, што баіцца, каб ліст не вярнуўся з адказам: “Не знайшлі яго на гэтым свеце”. У яго памяці жывуць “усе – не старыя, / Як раней, маладыя, жывыя” [2, с. 179]. Непакоіць сяброў лістамі ён не хоча.

Напісанне лістоў абыгрывае класік і ў вершы “Калісьці казала”: некалі за ім сачыла “дэфензіўская зграя” і ён атрымліваў лісты з казённага дома, змест якіх быў аднолькава вядомым – “пагражаў каталажкай”. А цяпер паэт радуецца лістам радні, сяброў, знаёмых, а таксама – лістам бяроз і загонаў, весткам жаўрукоў.

Як вядома, паэт меў вялікае пачуццё гумару. Так, у вершы “Шчаслівы дзень яднання” ён вобразна абыграў свой адыход: на працягу яго жыцця побач з ім былі і ворагі і сябры, і сярод тых, хто прыйдуць з ім развітацца, будуць не толькі сябры, але і нядобразычліўцы, “што ўсё жыццё / <…> кідалі / Пад ногі валуны”. “О, мір табе, / Шчаслівы дзень яднання!” [2, с. 63], – лагодна-ўсмешліва гаворыць паэт. Незвычайнае ўздзеянне і запамінальнасць твора дасягаюцца тым, што ў ім паэт выкарыстаў парадаксальнае спалучэнне кантрасных вобразаў: дзень пахавання – “шчаслівы дзень яднання”. У фінальных радках знаходзім евангельскі выраз “о, мір табе” – аўтар блаславўляе, жадае міру гэтаму дню.

Паэт, гаворачы пра старасць і свой узрост, з сумам заўважае, што з гадамі “ўсё цяжэй / Прыгодным быць / Да танца / І да ружанца” (верш “З гадамі усё цяжэй…”) [2, с. 128], пры гэтым ён звяртае ўвагу, што старое дрэва, нават ссечанае, застаецца карысным для людзей – дае цяпло.

У вершы “Якім нарадзіўся” ўвасоблены адзін з асноўных жыццёвых прынцыпаў М. Танка – быць самім сабой, адстойваць сябе і сваё, не слухаць шматлікіх парад дарадцаў. Паэту імпанавалі словы Гэршта, які перад шыбеніцай сказаў: “Якім нарадзіўся, / Такім мяне ешце” [2, с. 23]. І хоць у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

жыцці творцы было нямала дарадцаў, ён заўсёды заставаўся самім сабой. Гэта таксама паказчык моцнага характару паэта, яго смеласці і стойкасці.

Аўтарскае пераасэнсаванне свайго жыцця знаходзім у вершы “Пісьмо брату”. Брат паэта – сейбіт, не адарваўся ад зямлі, і Максім Танк, калі жыў у вёсцы, таксама быў сейбітам (магчыма, таму ён у гэтым творы называе сябе “былым сейбітам”). Творца расказвае брату, што ён у бальніцы і яму чамусьці сняцца плёсы, паплавы, журавы, цешыцца, што брат “застаўся верным плугу, і зямлі, / І спаконвечным звычаям бацькоў” [2, с. 149]. Пра сябе ж кажа: “А я, знаць, змарнаваў свае ўсе дні / На справы непатрэбныя, мой брат” [2, с. 149].

Разважанні пра трагізм жыцця сустракаюцца і ў вершы “Я прайшоў праз кастры інквізіцый…”. Лірычны герой твора ўспамінае, што ён прайшоў кастры інквізіцый, лясы мячоў і алебардаў, руіны надзей і цямніцы, часы цемрашальства, пагарды… Ды свой цяжкі лёс ён не пракляў, бо золак нагадаў яму ўсмешку немаўляці ў сне да свайго Анёла-ахоўніка. У гэтым творы няма канкрэтных элементаў аўтабіяграфізму, яго падтэкст вельмі глыбокі – філасофскае асэнсаванне чалавечага жыцця, цяжкасцей, якія выпадаюць на жыццёвым шляху, і вечнага кругавароту ў быцці Сусвету.

Шмат таямніц і загадак засталося для наступнікаў у творах Максіма Танка, гэтаксама – у яго дзённіках. Ён быў яркай і адметнай асобай, вельмі глыбокім паэтам, мудрым, з вялікім жыццёвым вопытам. Як вынікае з праведзенага даследавання, аўтабіяграфічных элементаў у зборніку “Мой каўчэг” даволі многа, у іх адлюстраваліся роздумы і перажыванні паэта, яго клопаты і радасці і такія рысы яго характару, як шчырасць, сардэчнасць, дабрыня. У вершах спалучана грамадскае і асабістае, нацыянальнае і агульначалавечае. Творчая спадчына М. Танка – гэта невычэрпная крыніца мудрасці.

Літаратура

1. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Бел. навука, 2006–2012. – Т. 10 : Дзённікі (1960–1994). – 2010. – 919 с.
2. Танк, М. Мой каўчэг : вершы. 1989–1992 / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 207 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ